# МЫ – РОЗНЫЯ

Прыйшоў на гэты свет я, каб любіць
Зямлю бацькоў гадзінай смутнаю,
Каб мовай веку з часам гаварыць,
Сваю шануючы, — пакутную.

Прыйшоў, каб лашчыць кветкі і траву,
Каб захапляцца стромкай хвояю,
Прыйіноў, каб неба бачыць сіняву
І дыхаць веснімі настоямі.

Прыйшоў на гэты свет я, каб рабіць
Дабро — пакуль яшчэ не позна нам!
І хоць мой лёс таксама дагарыць —
Шчаслівым быў!
Усе мы — розныя...

## ПОЎНЯ НА ВАДЗЕ

І поўня на вадзе, і пляск вясла,
І вуснаў шэпт шчасліва-патаемны —
Усё гэта чула-бачыла сасна
І благаслаўляла з кручы неймавернай.

Не доўга ёй рыпець на скразняках
На свеце белым, беднай, засталося:
Падмые строму Пціч
і ўніз — ба-бах! —
Як пераспелае нязжатае калоссе.

Ў паводку тое будзе, апасля...
Пакуль жа светам правіць узаемнасць:
І поўня на вадзе, і пляск вясла,
І вуснаў шэпт шчасліва-патаемны...

***

Пакуль бруяцца звонкія крыніцы
І громам аддаецца крыгаход,
Датуль жыццё нам дорыць таямніцы,
Якія расшыфроўваем штогод.

Пакуль сахаты прыткую ласіху
Прызыўна кліча ў стоены гушчар —
Нат браканьер ачомаецца крыху
І на імгненне спыніцца зямшар.

Пакуль буслы разважна і павольна
Блукаюць сярод лотаці і траў —
Нам дыхаецца чыста і прывольна
І на Зямлі не хутка ледастаў.

У АДЛІГУ

Як сілаю мароз не ганарыцца,
Але яго імгненна знікне сон,
Калі раптоўна студзень раздажджыцца,
Што хоць бяры у рукі парасон.

Сарвецца снег, агольваючы грыву
Ад зазімку прыгнутае сасне,
І зойдуцца у цінькканні шчаслівым
Сініцы, памыліўшыся ў вясне.

І мы таксама з вамі ў захапленні,
Хаця дакладна ведаем: штогод
За самым незвычайным пацягоіеннем
Заўжды пільнуе коўзкі галалёд...

КОНЬ

Ён марыў аб свабодзе:
Гарэў вачэй агонь.
Я адпусціў паводдзе —
Хай пагарцуе конь.
Ён заіржаў шчасліва,
Усё зразумеўшы ўміг,
Рвануў, ды так імкліва,
Што я ў сядле прыціх.
Іскрацъ аб брук падковы,
Трасецца грывы серп.
У дзень, у свет ліловы
Ляцець-імчаць няўсцерп.
Стрыжэ вушамі чуйна
На кожны новы гук,
А шыю выгнуў крута,
Нібы напяты лук.
Ляціць па чыстым полі,
Нібыта дзікі зноў...
Відаць, усё-ткі воля –
Аснова ўсіх асноў!

## ПАМЯЦІ АНАТОЛЯ ГРАЧАНІКАВА

Залатыя пяскі.
Меднастволыя хвоі.
Сож пяшчотна казыча
падмытую кручу,
А паветра, на травах
і кветках настоена,
Лечыць душы людзей
эліксірам гаючым.
Тут Паэта сляды.
Туг яго радаводы.
Смажаць ракаў сябры.
Ціха вогнішча тлее.
І так хочацца верыць
у вечнасць прыроды,
Бо цвітуць як раней
у затоцы лілеі.
“Пачакай-затрымайся, –
Шарпілаўка просіць, –
Не заўважыць адсутнасць
твой горад-мурашнік,
Бо ў вёсцы, пабач,
і мянташаць і косяць,
Толькі сілы якія –
і вымавіць страшна”.
Не пачуў.
І падаўся, нібы на прынаду,
Магістраль пакаціла
ў самае пекла,
Каб Шарпілаўка ведала
горада здраду,
То сякераю шпалы
на трэскі б пасекла...

***

*М. Богдановічу*

Вакол нябачнай восі
Круціся, шар зямны!
А мы – матуль сыны –
Тваіх надзей калоссе.

Хай смерць мяне падкосіць,
Абы збыліся сны:
Вакол нябачнай восі
Круціўся шар зямны!..

***

Бацькаўшчына — могілкі на ўзгорку,
Ластаўкі на хісткіх правадах,
Бразгаюць даёнкі на падворках,
Наліваюцца антонаўкі ў садах.

Водбліскі раптоўнай навальніцы,
Дождж са цмянай назваю “сляпы”,
Смак вады студзёнае з крыніцы,
ТумаНоў надрэчныя слупы.

Яканне і цеканне ў гаворках,
Васількі у зрэнках маладзіц...
Прыгадаўшы гэга, ўпаў бы ніц
За цябе... і могілкі на ўзгорку!

## НА ДЗЯДЫ

Абклалі нас, нібы ваўкоў:
Наўкол сцяжкі чырвоныя.
А ў нас — ні поўсці, ні клыкоў —
Безабаронныя.

Калі і ёсць які зарок,
Дык тэта мова матчына!
Ды Беларусь — зямлі шматок
З чарнобыльскаю спадчынай.

Але звужаюць свой загон
Прывычна паляўнічыя.
Зліліся ў рэха гул і звон
І крыкі ваяўнічыя.

Яшчэ хвіліна і:
                    Ату!

З нагайкамі, праклёнамі...
А мы на Бацькаўшчыну тут —
Благаслаўлёныя!..

***

А тут адны бярозы, ды крыжы,
У колер сіні ўсе пафарбаваны...
І мы тут будзем,
Хоць жыццё пражыць
Па-рознаму ўсім наканавана...
І я сюды прыходжу на паклон,
Падмесці лісце,
Вынішчыць бадылле,
Калі цяпло кастрычнік выльe
І ўсё ў прыродзе хіліцца на сон.
Утульна пад бярозамі...
Вякі
Цяпер бацькоўскае магілкам
Сіратлівым
Дадуць спакой,
Што ў жыцці хлуслівым
Не сніўся вам і ўзімку,
Землякі...
Прыходзьма кожны ў гэты смутны кут
Схіліць галовы,
Выказаць пашану
Бацькам,
Радні,
Бо ў свеце згвалтаваным
Ніхто і нас не збавіць ад пакут...

## ВЯСЁЛАЕ ПОЛЕ

*Вясёлае Поле – вёска ва Урыцкім сельсавеце*
*Гомельскага раёна. Спалена фашыстамі*
*Ў 1943 годзе і не адноўлена.*

Вясёламу Полю – не весела,
Вясёламу Полю – не песенна,
І ранняй вясной, як адснежыцца,
Дзіцячы тут смех не прарэжацца.

Не зойдуцца клёкатам зранку
Буслы над сваёю буслянкай,
Каханне да весніц не туліцца:
Ні весніц,
ні хат
і ні вуліцы.

Адзін абеліск непрыкметны
Ўглядаецца ў жыта ўлетку:
Мо з'явіцца хто,
абзавецца,
Глядзіш, весялей зажывецца.

А ўзімку ні мары, ні жыта,
Марозам і снегам спавітае
Вясёлае Поле,
Вясёлае Поле…
Ды сумная доля.

ХРАМЫ

Будуюць храмы ў вёснах і сталіцах,
Нібы не руйнавалі іх ніколі,
Бо вельмі модным стала памаліцца,
Каб выпрасіць у Бога лепшай долі.

Будуюць храмы з цэглы і бярвенняў,
І талакой, і ў складчыну, і проста
З калгаснай касы сродкі пакаленняў
Ідуць на кошт Вялікаднага посту.

У Бабічах, як спыніцца транзітны,
Дзябёлыя заходзяць маладзіцы:
“Царкву заклалі, будзе знакамітай,
Хто веруе, падайце на званіцу...”

Куды не йдуць бабулькі пасланцамі,
Пералічыць я нават не бяруся:
Такі наш лёс гаротны – быць старцамі
На вольнай і прыгожай Беларусі.

Будуюць храмы ў вёснах і сталіцах...
Не супраць я, але прызнацца мушу:
Злачынцу дастаткова памаліцца,
І ён — святы...
А храмы — ў нашых душах.

Вясной у дзень чарнобыльскага смутку
Ад тлумных каранованых сталіц
Яны, дарог раскручваючы скруткі,
Вяртаюцца да родных аканіц.

На матчыных магілках на пагостах
У Бабчыне, Пасудаве, Круках
Становяцца даступнымі і простымі
Паэты са слязамі на вачах.

Іх – салаўёў, што вырваліся з клеткі, –
Засведчаць на радзіму пералёт
На Камароўцы купленыя кветкі
І кніжкі вершаў, тонкія, як кнот.

Іх месца тут.
Спагаддіва прырода

Суцішыцца на некалькі хвілін,
Як загучаць зусім не прынародна
Радкі для маці,
                    што чытае сын.

...Маўчаць утравянелыя магілы,
Сягонняшніх пазбаўленыя драм.
Жанчынам, што паэтаў нарадзілі,
Не манументы ўзводзіў бы,
                                        а Храм!

ЗУБРЫ ПАД ТУРАВАМ

Напятую, як полаг, цішыню,
Якою Тураў цешыцца прывык,
За сто гадоў, напэўна, упершыню,
Бы рогам, паласнуў зубрыны рык.

Аж скалануліся вячыстыя дубы,
Якія смерч иаварушыць не мог,
Пасыпаліся долу жалуды
І лісце закулялася ля ног.

У Азяранах сціх сабачы брэх –
Інстынкт самаахове спрацаваў,
Бо ў пакаленнях страчана, на грэх,
Што продак ім калісь наканаваў.

Упершыню за колькі мо вякоў
Дайшло да гэтых рыжых валацуг:
Ратуе іх ад страху і клыкоў
Спрадвечны вораг – кованы ланцуг.

…А рэха рвалася на поле і ў сады,
Апавяшчала стоены абшар,
Што ў стольны Тураў сёння назаўжды
Вярнуўся самы першы гаспадар.

НАША МОВА

Калі браць шчасце за аснову
Трывог спрадвечных і здабыткаў,
Удзячны маці я за мову,
Што сам народ на кроснах выткаў.

Яна ў душы
Узой пляскоча
І промнем сонца цёплым служыць,
А ў цішыні зімовай ночы

Сняжынкай лёгка ў небе кружыць.
Яна і ў красках першых вясніх,
Яна ў лісцёвым шматгалоссі,
У салаўіных звонкіх песнях

І ў ціхім шоргаце калоссяў.
І на таку яна ў засекі
Цячэ адборным цёплым збожжам.
А мы — з дзяцінства недарэкі —
Любіць яе як след не можам...